УДК 316.77

***Д. В. Якаўчык,***
*курсант 4-га курса факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС*
*Навуковы кіраўнік: С. В. Венідзіктаў,*
*начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

# ІНФАРМАЦЫЙНА-КАМУНІКАТЫЎНАЯ КАМПЕТЭНТНАСЦЬ АСОБЫ

Зараз інфармацыйныя тэхналогіі актыўна ўкараняюцца ва ўсе сферы жыцця, што прыводзіць да змены патрабаванняў да кампетэнтнасці асобы. Для эфектыўнай працы ў сучасным свеце чалавек павінен валодаць не толькі базавымі ведамі і навыкамі, але і інфармацыйна-камунікатыўнай кампетэнтнасцю.

Інфармацыйна-камунікатыўная кампетэнтнасць асобы — гэта складанае паняцце, якое аб’ядноўвае мноства навыкаў і ўменняў, што дазваляюць чалавеку эфектыўна атрымліваць, апрацоўваць і перадаваць інфармацыю ў розных сферах жыцця. Дадзены від кампетэнтнасці аб’ядноўвае ў сабе камунікацыю, працу з інфармацыяй, рэалізацыю сацыяльнай ролі, талерантнае стаўленне да партнёраў па зносінах, уменне ствараць аптымальную камунікатыўную прастору, інтэграцыю IT-ведаў і асабістых якасцей у больш агульную здольнасць дзейнічаць у прасторы інфармацыйных рэсурсаў інтэрнэту, уменне арганізоўваць унутраныя і знешнія інфармацыйныя рэсурсы, авалодваць новымі знакавымі сістэмамі і г. д. [1].

У структуры інфармацыйна-камунікатыўнай кампетэнтнасці вылучаюцца элементы:

1) камунікатыўная кампетэнтнасць, якая ўключае ў сябе веданне і ўменне выкарыстоўваць нормы, правілы вядзення дыялогу, уменне разумець сэнс выказвання, эмацыянальны настрой суразмоўцы і іншыя параметры зносін (у вербальнай, невербальнай і пісьмовай форме);

2) інфармацыйная кампетэнтнасць, якая складаецца з ведання асноўных паняццяў і метадаў атрымання і выкарыстання інфармацыі, асноў логікі пошуку і ацэнкі зыходных даных, лагічнага аналізу атрыманых звестак;

3) функцыянальная кампетэнтнасць, якая ўключае ў сябе здольнасць разумець канкрэтныя сферы дзейнасці, звязаныя з выкарыстаннем інфармацыі ў соцыуме, процідзеяннем маніпуліраванню з боку сродкаў масавай камунікацыі [2];

4) тэхнічная кампетэнтнасць, якая прадугледжвае ўменне карыстацца рознымі праграмнымі прадуктамі для пошуку, аналізу і апрацоўкі даных;

5) медыякампетэнтнасць, якая заключаецца ў веданні існуючых і магчымых прыёмаў работы з рознымі медыяфарматамі, ва ўменні арыентавацца ў іх;

6) адаптыўная кампетэнтнасць — уменне прыстасоўвацца да змен у асяроддзі, здольнасць хутка адаптавацца да зменлівых умоў;

7) аксіялагічная кампетэнтнасць — здольнасць рэгуліраваць свае паводзіны ў рамках значных агульначалавечых каштоўнасцей (сацыяльнае партнёрства, талерантнасць);

8) лінгвістычная кампетэнтнасць — уменне правільна будаваць выказванні, фарміраваць асэнсаваныя тэксты, суадносіць выразы з адпаведнай сацыякультурнай сітуацыяй.

Такім чынам, структура інфармацыйна-камунікатыўнай кампетэнтнасці асобы ўключае ў сябе шэраг элементаў, кожны з якіх адыгрывае важную ролю ў працэсе зносін і работы з інфармацыяй, аб'ядноўваючы сукупнасць якасна новых ведаў, уменняў і навыкаў [3].

Інфармацыйна-камунікатыўная кампетэнтнасць — адзін з ключавых элементаў паспяховай сацыяльнай адаптацыі і прафесійнага развіцця асобы. Усведамленне важнасці развіцця інфармацыйна-камунікатыўнай кампетэнтнасці дазваляе індывіду адаптавацца да зменлівага інфармацыйнага асяроддзя і эфектыўна ўзаемадзейнічаць з медыйнай прасторай.

1. Клименко Е. И. Информационно-коммуникативная компетенция — ключевое понятие современного образования // Молодой ученый. 2015. № 22 (102). С. 816–818. Вернуться к статье

2. Venidiktov S. V. Media and information competence of a modern specialist // Обеспечение качества образования : материалы I Междунар. науч.-метод. конф., Минск, 2 февр. 2023 г. / М-во образования Респ. Беларусь ; редкол.: О. З. Рыбаключева (отв. ред.) [и др.]. Минск, 2023. С. 9–13. Вернуться к статье

3. Смирнова И. Г. Педагогические условия формирования информационно-коммуникативной компетенции студентов в образовательном процессе вуза : дис. … канд. пед. наук : 13.00.01 / И. Г. Смирнова. Воронеж, 2011. 188 с. Вернуться к статье